Аляксандар Гатоўскі

# ГАНДЛЁВЫЯ АДНОСІНЫ БЕЛАРУСІ З РАСІЯЙ

## Сучасны стан гандлёвых адносінаў Беларусі з Расіяй

Расійская Фэдэрацыя ёсьць асноўным партнэрам Беларусі ў вонкавым гандлі. У 2001 годзе тавараварот зь ёю складаў 9190,4 мільёна даляраў ЗША, тады як

Дыяграма 1. Вонкавы гандаль Рэспублікі Беларусі ў 2001 годзе




увесь тавараразварот — 15477,2 мільёна[1]. “Вага” Расіі ў вонкавым гандлі Беларусі склала летась 59,4%, пры гэтым доля ў экспарце складае 53,1% і аж 65,2% у імпарце. Ніводная зь іншых краінаў у гэтых пакazьніках не дараўняецца Расіі (дыяграма 1).

Да гэтай дыяграмы трэба дадаць, што амаль увесь гандаль з краінамі СНД прыпадае на гандаль з Расійскай Фэдэрацыяй. Яе вага ў вонкавагандлёвым звароце Беларусі з краінамі СНД складае 91,2%, у тым ліку 88,1% у экспарце і 93,6% у імпарце.

Аснову беларускага экспарту ў Расію складаюць “сродкі наземнага і паветра-

[1] Статыстычныя крыніцы глядзі ў канцы артыкулу.

нага транспарту” (19,6% ад усяго экспарту ў Расію ў 2001 годзе), г.зн. грузавыя аўтамабілі, трактары, вэлясыпэды і інш. На другую пазыцыю — “машыны, абсталяваньне і мэханізмы”, г.зн. бульдозэры, сельскагаспадарчыя машыны, электрычныя трансфарматары і рухавікі, мэталаапрацоўчыя станкі, падшыпнікі, тэлевізары, лядоўні і г.д., прыпадае 18,5%. Трэці буйны артыкул — “тэкстыль і тэкстыльныя вырабы”, якія складаюць 11,4% экспарту ў Расію.

Аснову беларускага імпарту з Расіі складаюць “мінэральныя прадукты”— 41,8% ад усяго аб’ёму. Гэта вугаль, нафта, прыродны газ. Другая буйная пазыцыя — “некаштоўныя мэталы і вырабы зь іх” (14,3% ад імпарту): чорныя мэталы, медзь, алюмінь і сплавы зь іх.

Экспарт беларускай прадукцыі арыентаваны ў асноўным на Цэнтральную фэдэральную акругу Расіі (64,1% ад усяго экспарту ў Расійскую Фэдэрацыю ў 2001 годзе, на Маскву прыпадае 42,4%) і на Паўночна-Заходнюю фэдэральную акругу — 12,6% (7,8% прыпадае на Санкт-Пецярбург). Імпартуецца расійская прадукцыя ў асноўным з Уральскай фэдэральнай акругі — 42,6% ад усяго імпарту з Расіі (у тым ліку 40,6% зь Цюменскай вобласьці) і з Цэнтральнай фэдэральнай акругі — 41,5% (28,6% прыпадае на Маскву).

Беларускія прадпрыемствы залежаць як ад расійскага рынку збыту, так і ад расійскай сыравіны і энэрганосбітаў. У Расію вывозіцца 83,6% усіх зробленых у Беларусі мэталаапрацоўчых станкоў, 73,8% вэлясыпэдаў, 70% аўтамабільных шынаў, 68,4% тэлевізараў, 68% трактароў, 66,7% грузавых аўтамабіляў, 47,2% лядоўняў, 43,8% хімічных валокнаў і інш. Імпарт прыроднага газу з Расіі складае 100% ад усяго спажыванага Беларусяй газу, каменнага вугалю — 97,3%, чорных мэталаў — 89,6%, нафты — 86,5%. Прычым прыродны газ Беларусь імпартуе па 31 даляру за тысячу кубамэтраў, тым часам як сусьветная цана на яго становіць каля 110 даляраў.

З колькаснага боку гандаль з Расіяй для Беларусі вельмі важны. Але ці гэты гандаль такі ж важны і зь якаснага боку?

На першы погляд гэта так. Расія валодае ёмістым рынкам збыту і багатымі прыроднымі рэсурсамі. Беларусь імпартуе з Расійскай Фэдэрацыі сыравіну (энэрганосбіты і мэталы), а экспартуе ў яе прадукцыю перапрацоўчай прамысловасьці — грузавыя аўтамабілі, трактары, сельскагаспадарчыя машыны, мэталаапрацоўчыя станкі, тэлевізары, лядоўні, тэкстыль. Каб разабрацца ў сытуацыі падрабязьней, разгледзім дынаміку гандлёвых адносін Беларусі з Расіяй у 1991—2001 гадох.

## Вонкавы гандаль і ўзровень жыцьця ў Беларусі

У 1992—1994 гадох дзяржаўныя прадпрыемствы становяцца больш самастойнымі. Дзякуючы скарачэньню дзяржаўнай замовы ў эканоміцы, лібэралізацыі цэнаў і скасаваньню манаполіі дзяржавы на вонкавы гандаль паміж суб’ектамі гаспадараньня разьвіваюцца рынкавыя дачыненьні. У гэтую пару ства-





раецца шмат фірмаў-пасярэдніцаў, якія гандлююць беларускай прадукцыяй як у межах Беларусі, так і за яе межамі.

Мытнае дэкляраваньне тавараў у гэтую пару яшчэ не было ўведзенае, таму нават урад Беларусі меў даволі цьмянае ўяўленьне аб памерах і кірунках айчыннага вонкавага гандлю. Дакладна было вядома толькі, што аб’ём вытворчасьці на Беларусі скарачаецца і гэта адбіваецца на аб’ёмах спажываньня расійскага газу і нафты. Калі, напрыклад, у 1990 годзе было імпартавана 37,5 мільёна тонаў нафты і 18,8 мільярда кубамэтраў газу, то на 1993 год гэтыя паказьнікі зьнізіліся да 11,8 млн. тонаў і 16,3 млрд. кубамэтраў, а на 1994 году і зусім да 11,2 млн. тонаў і 14,3 млрд. кубамэтраў адпаведна.

Некаторыя экспэрты рабілі разьлікі наконт аб’ёму і кірунку беларускага гандлю ў гэты перыяд[2]. Згодна зь імі, да 1995 году ўлучна дзеяла тэндэнцыя пераарыентацыі вонкавага гандлю Беларусі з краінаў СНД на міжнародныя рынкі, пашыраўся экспарт і імпарт у краіны ЭС. Пацьвердзіць ці зьняпраўдзіць гэтыя вывады статыстычнымі лічбамі немагчыма, паколькі ўся вонкавагандлёвая статыстыка да 1995 году грунтавалася на справаздачах найбуйнейшых прадпрыемстваў аб пастаўках на ўнутраны і вонкавыя рынкі і ня ўлічвала апэрацыяў прыватных фірмаў.

Дакладна вядома, што на 1995 год доля краінаў, якія не ўваходзілі ў склад СНД, у вонкавагандлёвым звароце краіны станавіла 35,3% (37% у экспарце і 34% у імпарце), краінаў СНД без Расіі — 15% (17,5% у экспарце і 12,7% у імпарце) і Расіі — 49,7% (45,5% у экспарце і 53,3% у імпарце).

З 1996 году тэндэнцыі мяняюцца. Вонкавагандлёвы зварот Беларусі, выражаны ў далярах ЗША, пачынае расьці, але пераважна не з індустрыяльна разьвітымі краінамі, а з Расійскай Фэдэрацыяй. Калі у 1997 годзе вонкавагандлёвы зварот Беларусі з краінамі, якія не ўваходзілі ў склад СНД, склаў 130,9% ад узроўню 1995 году, з краінамі СНД без Расіі — толькі 112,2%, то з Расіяй — аж 183,5%. Адпаведна, доля краінаў, якія не ўваходзілі ў склад СНД, у вонкавагандлёвым звароце зьнізілася да 30%, прычым пераважна за кошт экспарту, а не за кошт імпарту. Асобна трэба адзначыць памяншэньне аб’ёму экспарту ў краіны Заходняй Эўропы з 452,4 млн. даляраў ЗША ў 1995 годзе да 383 млн. даляраў у 1997 г. Экспарт у краіны СНД, апрача Расіі, зьнізіўся на трэць, у выніку чаго яго доля ў агульным аб’ёме экспарту Беларусі склала толькі 8,2%. Доля імпарту станавіла 13,1% — і амаль не зьмянілася. А вось доля Расіі ў таваразвароце вырасла да 59%, прычым за кошт экспарту, доля якога ў агульным аб’ёме павялічылася аж на 20% і склала 65,5%. Доля імпарту з Расіі засталася на ранейшым узроўні.

Такім чынам, у 1996—1997 гадох адбываецца пераарыентацыя беларускага экспарту з краінаў Заходняй Эўропы і СНД на Расійскую Фэдэрацыю. Арыентацыя імпарту значна не мяняецца. Зьмяненьне кірунку беларускага экспарту

[2] Гл. напрыклад: Злотников Л.К. Влияние протекционизма на развитие белорусской экономики // Экономическая политика. Анализ и альтернатива.— Мн., 1999.— С. 116—126.

было абумоўлена ў першую чаргу абранай эканамічнай палітыкай. Пасьля правядзеньня ў 1995 годзе фінансавай стабілізацыі высьветлілася, што беларускія тавары ня вельмі канкурэнтаздольныя, склады запоўненыя гатовай прадукцыяй, а прадпрыемствы працуюць толькі два-тры дні ў тыдзень. Узровень канкурэнтаздольнасці прадукцыі было вырашана павышаць шляхам адмовы ад жорсткага валютнага курсу, фінансаваньня будаўніцтва жытла і сельскай гаспадаркі. Усё гэта прывяло да дэвальвацыі беларускага рубля, а зь зьніжэньнем кошту нацыянальнай валюты зьнізіўся і кошт беларускіх тавараў, кошт працы ў Беларусі.

Паказальны ў гэтым сэнсе канец 1996 — пачатак 1997 году. Калі ў студзені—лютым 1996 году сярэдняя заработная плата ў Беларусі складала 80,7 даляра ЗША, то ўжо на студзень—люты 1997 году яна зьнізілася да 60,0 даляра (у пераліку праз рынкавы валютны курс). Сярэдні ўзровень цэнаў беларускай прамысловасьці, выражаны ў далярах ЗША, зьнізіўся за той жа пэрыяд на 28,5%. Фізычны аб’ём экспарту ў 1997 годзе вырас амаль на 35% у параўнаньні з 1996 годам. Прырост прамысловасьці склаў 18,8%, тым часам як у сельскай гаспадарцы, якая працавала на патрэбу ўсё больш зьбеднелага насельніцтва, было зафіксавана зьніжэньне вытворчасьці на 5,5%, нягледзячы на моцную падтрымку дзяржавы. Лёзунгам беларускіх вытворцаў стала “Невысокая якасьць, але нізкія цэны за кошт таннай працы!” Такая стратэгія не адпавядала патрабавальнаму эўрапейскаму рынку, але вельмі падыходзіла для ня вельмі багатых, ахвочых да тандэту расійцаў. Ім нават ня трэба было плаціць за беларускую прадукцыю грашыма. Разнастайныя бартэрныя ўгоды сталі нормай для беларуска-расійскіх адносінаў. Аднабаковая арыентацыя на расійскі рынак узмацнялася супольнай мытнай прасторай, якая адгароджвала Беларусь ад Захаду высокімі мытнымі тарыфамі. Нізкія расійскія цэны на прыродны газ павялічвалі канкурэнтаздольнасць беларускіх вытворцаў, але ўганялі айчынную прамысловасьць у большую залежнасьць ад Расіі.

Гэтая арыентацыя гукнулася беларусам у 1998 годзе пасьля жнівеньскага

Дыяграма 2. Тавараварот Рэспублікі Беларусі (млн. даляраў ЗША)








крызысу. Разам з расійскім рублём абваліўся і беларускі. У пачатку 1999 году цэны беларускага імпарту былі на 20% ніжэйшыя, чымся ў пачатку 1998 году, тым часам як цэны экспарту — на 32%. Беларускія тавары сталі яшчэ больш таннымі, а зарплаты — зусім нізкімі. У студзені—лютым 1999 году сярэднямесячная заработная плата ў Беларусі складала 23,4 даляра ЗША па рынкавым курсе, у той час як у Расіі — 52,1 даляра.

Зьніжэньне цэнаў экспарту прывяло да памяншэньня тавараабароту краіны з 15990 млн. даляраў ЗША ў 1997 годзе да 12583 млн. у 1999 годзе. Прычым узровень тавараабароту з краінамі, якія не ўваходзяць у СНД, застаўся на ранейшай адзнацы, а з Расіяй зьнізіўся на 26% (гл. дыяграму 2).

Апошнія два гады назіраецца паступовае нарошчваньне аб’ёмаў тавараабароту з краінамі, якія не ўваходзяць у склад СНД, і аднаўленьне тавараабароту з Расіяй. Але калі ўзровень цэнаў імпарту ў 2001 годзе амаль дасягнуў узроўню 1997 году, то цэны беларускага экспарту застаюцца ўсё яшчэ ніжэйшымі амаль на 15%.

## Вонкавы гандаль і вытворчасьць у Беларусі

Такая вонкавагандлёвая палітыка, згодна з задумай ейных аўтараў, мелася прывесьці да разьвіцьця вытворчасьці ў Беларусі, да павелічэньня якаснай “вагі” беларускай эканомікі ў межах усёй сусьветнай эканамічнай сыстэмы. Ёсьць даволі простая мэтодыка ацэнкі якаснай “вагі” асобнай эканомікі ў сусьветнай эканамічнай сыстэме, а таксама ў гандлёвых адносінах зь іншымі краінамі. Гэта ацэнка таго, што пераважна экспартуе эканоміка — высокатэхналягічныя тава-

Дыяграма 3. Экспарт Рэспублікі Беларусі, дыфэрэнцыяваны па тэхналягічнасьці (тысяч даляраў ЗША)




[3] Гл. больш падрабязна ў [5, С. 140— 143]

ры ці тавары, вытворчасьць якіх заснаваная на апрацоўцы сыравіны і некваліфікаванай працы.

Каб высьветліць, што экспартуе й імпартуе Беларусь, трэба, згодна зь міжнароднай мэтодыкай, аднесьці асобныя пазыцыі экспарту і імпарту да чатырох катэгорыяў: *прадукцыя высокай тэхналягічнасьці*, куды ўваходзяць мікрасхемы, кампутары, тэлевізары, абсталяваньне сувязі, фармацэўтычныя вырабы й інш.; *прадукцыя сярэдневысокай тэхналягічнасьці* — электрычныя рухавікі, мэталаапрацоўчыя станкі, трактары, аўтамабілі, лядоўні, гадзіньнікі, азотныя ўгнаеньні, прадукты арганічнай і неарганічнай хіміі; *прадукцыя сярэднянізкай тэхналягічнасьці* — прадукты перапрацоўкі нафты, чорнай і каляровай мэталюргіі. Апошняя, чацьвёртая група, “*прадукцыя нізкай тэхналягічнасьці і сыравіна”* — энэрганосьбіты, драўніна і вырабы зь яе, папера, харчовыя тавары і сельскагаспадарчая сыравіна, тэкстыль і тэкстыльныя вырабы, мэбля і калійныя ўгнаеньні[3].

Калі разгледзець экспарт Беларусі з такога ракурсу, то высьветліцца (гл. дыяграму 3), што апошнія пяць гадоў (падчас рэалізацыі стратэгіі “таннага беларускага рубля”) найбольшы прырост быў дасягнуты ня ў экспарце тэхналягічнай прадукцыі (высокага і сярэдневысокага ўзроўню — тэлевізараў, лядоўняў, трактароў, аўтамабіляў, мэталаапрацоўчых станкоў й г.д.), а ў экспарце сярэднянізкай (прадукты перапрацоўкі нафты) і нізкай тэхналягічнасьці (драўніна, тэкстыль і тэкстыльныя вырабы, калійныя ўгнаеньні, сельскагаспадарчая сыравіна). Прычым павелічэньне экспарту нізкатэхналягічных прадуктаў адбылося як у краіны СНД (Расію), так і ў краіны, якія не ўваходзяць у СНД. Што ж датычыцца экспарту тэхналягічных вырабаў, то адбылася яго пераарыентацыя з Захаду (куды іх экспарт зьнізіўся) на Ўсход.

Дыяграма 4. Імпарт Рэспублікі Беларусі, дыфэрэнцыяваны па тэхналягічнасьці (тысяч даляраў ЗША)








На сёньняшні дзень беларуская прамысловасьць збольшага перапрацоўвае сыравіну. У беларускім экспарце сыравіна і нізкатэхналягічная прадукцыя пераважаюць над вырабамі высокай і сярэдневысокай тэхналягічнасьці. І гэта без прадуктаў нафтаперапрацоўкі і мэталюргіі, якія займаюць другое месца ў таварнай структуры беларускага экспарту нават без уліку перапрацоўкі нафты па давальніцкіх схемах (улічваецца як экспарт паслуг)!

Што датычыць структуры беларускага імпарту, то ў вочы кідаецца наступнае (гл. дыяграму 4). Найбольшую долю складае катэгорыя “нізкатэхналягічная прадукцыя і сыравіна” за кошт імпарту энэрганосьбітаў, прычым апошнім часам адзначаецца яе рост з-за павелічэньня аб’ёмаў пераапрацоўкі расійскай нафты з далейшым яе экспартам на Захад.

У імпарце высокатэхналягічных вырабаў вялікую долю займае прадукцыя індустрыяльна разьвітых краінаў. Гэта кінэскопы, мікрасхемы й іншыя кампанэнты, зь якіх вырабляюцца беларускія тэлевізары й інш., што пасьля пад выглядам “высокатэхналягічнай прадукцыі Рэспублікі Беларусі” экспартуюцца ў Расію. Вырабы сярэдневысокай тэхналягічнасьці прыпадаюць на краіны СНД і рэшты сьвету дзесьці пяцьдзясят на пяцьдзясят. Гэта рухавікі, розныя вузлы, якімі камплектуюцца беларускія трактары, аўтамабілі й інш., якія таксама экспартуюцца ў Расійскую Фэдэрацыю.

Беларускі гандаль трымаецца на, па-першае, зборцы з заходнеэўрапейскіх камплектуючых таннай беларускай працоўнай сілай “тэхналягічных беларускіх вырабаў” для Расіі, па-другое, неглыбокай перапрацоўцы расійскай сыравіны (у першую чаргу нафты) для заходняга рынку і, па-трэцяе, экспарце сваёй сыраві-

Дыяграма 5. Структура экспарту і імпарту Беларусі



ны (неапрацаваная драўніна, калійныя ўгнаеньні) і таннай прадукцыі (тэкстыль і вырабы зь яго, мэбля) як на Захад, так і на Ўсход.

Што датычыць зьменаў у вонкавым гандлі Беларусі за апошнія пяць гадоў, то зь якаснага пункту гледжаньня іх можна ахарактарызаваць, па-першае, як *паглыбленьне адставаньня ў эканамічным разьвіцьці ад краінаў Захаду*, што відаць з памяншэньня долі тэхналягічнай прадукцыі (высокага і сярэдневысокага ўзроўню) у беларускім экспарце на Захад і павелічэньня яе долі ў імпарце з Захаду (дыяграма 5). Па-другое, як *завязанасьць беларускай эканомікі на Расію*, што відаць з структуры вонкавага гандлю з краінамі СНД (улучна з Расіяй).

Аднабаковая вонкавагандлёвая стратэгія прывяла да того, што Беларусь замкнула сама сябе на Расію і ў колькасным, і ў якасным пляне, што не спрыяла ні павышэньню ўзроўню жыцьця, ні разьвіцьцю тэхналягічнасьці вытворчасьці. Арыентацыя збыту гатовых вырабаў толькі на расійскі рынак, патрабавальны ня столькі да якасьці, колькі да цаны, падтрымка канкурэнтаздольнасьці беларускай прадукцыі за кошт таннай працы дазволілі рэжыму, не зьмяняючы істотна тэхналёгію вытворчасьці, падтрымліваць прадпрыемствы ў рабочым стане. Але тая ж стратэгія прывяла да стрымліваньня эканамічнага разьвіцьця краіны ўзроўнем разьвіцьця расійскай эканомікі, якая будуе сваю стратэгію на экспарце энэрганосбітаў, мэталаў і драўніны (84,1% у расійскім экспарце ў студзені—лютым 2002 г.).

## Статыстычныя крыніцы:

1. Внешняя торговля Республики Беларусь. 1995— 2000 / Министерство статистики и анализа Республики Беларусь.— Мн. 2001.— 370 с.

2. Внешняя торговля Республики Беларусь в январе—декабре 2001 года / Министерство статистики и анализа Республики Беларусь.— Мн. 2002.

3. Статистический бюллетень. Ежемесячник / Министерство статистики и анализа Республики Беларусь.— Мн. 1997—2001 гг.

4. О работе народного хозяйства Республики Беларусь. Ежемесячник / Министерство статистики и анализа Республики Беларусь.— Мн. 1994—2001 гг.

5. Статистические материалы / О.Е. Гулида, В.Н. Тамашевич // Белорусский экономический журнал.— 2001. — №3 — С. 138—148.